В 1949 г. С.А.Кусевицкий передал руководство Бостонским симфоническим оркестром Шарлю Мюншу, сосредоточив свое внимание на деятельности курсов для молодых дирижеров в организованном им Беркширском музыкальном центре. Летний фестиваль в Тангвуде с участием Бостонского оркестра, основанный также Кусевицким, и в настоящее время является одним из крупнейших в музыкальной жизни Запада.

Скончался С.А.Кусевицкий 4 июня 1951 г.

В настоящее время в США проводится конкурс дирижеров имени С.А.Кусевицкого, в числе его лауреатов К.Аббадо, Э.Инбал и другие видные современные музыканты.

Пожалуй, трудно назвать имя какого-либо другого русского дирижера, чья деятельность была бы столь же многогранной и продуктивной, кто сделал бы как дирижер так много полезного и важного для русской симфонической музыки. Выдающийся музыкант огромного творческого диапазона, оказавший влияние на развитие художественной культуры многих стран, Сергей Александрович Кусевицкий вошел в историю музыкального исполнительства как ярчайший представитель русской дирижерской школы XX в.

**Т.І.Васюк,**
*дацэнт*

## ТРЫАДЗІНАЯ АСОБА УЛАДЗІМІРА ВІКЕНЦЬЕВІЧА УГРЫНОВІЧА

Уладзімір Вікенцьевіч Угрыновіч быў цудоўным мастаком-керамістам, выдатным выкладчыкам і руплівым даследчыкам на ніве беларускай керамікі, якой ён прысвяціў сваё кароткае жыццё.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчы шлях У.В.Угрыновіча пачаўся на кафедры керамікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута ў 1969 г. Праца з глінай ставіла перад Уладзімірам Вікенцьевічам трыадзіную задачу — быць выкладчыкам, быць мастаком і даследчыкам.

Дзяцінства У.В.Угрыновіча прыпала на гады вайны. Лёс не песціў хлопчыка ў пасляваенным Мінску: ён рос без маці, а бацька прыхіліўся да сына толькі ў сталыя гады. Свае душэўныя раны Уладзімір Вікенцьевіч лячыў мастацтвам. Ён скончыў Мінскае мастацкае вучылішча і марыў займацца жывапісам, але лёс прывёў яго да керамікі. Кафедрай керамікі тады кіраваў М.В.Бяляеў, выкладалі В.Г.Гаўрылаў і Т.М.Паражняк (яны былі запрошаны ў Мінск з Львова). Гэтыя мастакі многа ведалі аб тэхналогіі керамікі і яе вытворчасці і перадавалі свае веды вучням. Уладзімір Вікенцьевіч пасля заканчэння інстытута застаўся працаваць на кафедры, ён заняўся вывучэннем беларускай керамікі і яе гісторыі. Студэнты яму верылі і любілі яго. Здавалася часам, што ён не выходзіць з майстэрні, працуючы там плённа і натхнёна.

Першае адкрыццё Уладзімір Вікенцьевіч зрабіў у час вучобы. Навучэнца ўразілі Івянец і яго школа керамікі. З 1968 г. і да апошняга дня жыцця ён ездзіў туды як на бацькаўшчыну. Гістарычныя звесткі сведчаць аб тым, што керамічнае рамяство ў Івянцы ўзнікла амаль пяцьсот гадоў таму. Нехта вельмі трапна назваў Івянец "каралеўствам" ганчарнай вытворчасці Беларусі. Івянецкія майстры ведалі аб гліне ўсё і ўмелі вырабляць таксама ўсё. Тут працавалі ў асноўным дынастыі і сем'і. Вучні напачатку працавалі па найме і зваліся чаляднікамі. Набыўшы пэўны запас ведаў і майстэрства, чаляднік здаваў іспыты на права быць майстрам. У Івянцы Уладзімір Вікенцьевіч здаў свой экзамен на званне майстра і мастака глінянай справы, вельмі не простай і надзвычай скрупулёзнай. Ён асвоіў сакрэты

тутэйшых майстроў. У пачатку 80-х гг. Уладзімір Вікенцьевіч робіць серыі дэкаратыўных пано ў форме талерак па фальклорных матывах, што па мастацкай дасканаласці сталі энцыклапедычнымі творамі. Ён вельмі многа працаваў над стварэннем набораў посуду, якія маюць ганчарную аснову і аўтарскую пластыку. Угрыновіч капіраваў асартыментныя групы мастацкага посуду Івянца, на базе гэтых ведаў рабіў свае, аўтарскія наборы. Івянецкія майстры навучылі Уладзіміра Вікенцьевіча рабіць кафлю, гліняныя цацкі, свісцёлкі, посуд, пластыку ў выглядзе фігурак людзей, зуброў, львоў.

Івянец быў вельмі спрыяльнай глебай для мастака-кераміста. У пачатку XX ст. тут існавала арцель ганчароў, якая складалася з асобных майстэрняў. Да Вялікай Айчыннай вайны такіх майстэрняў у Івянцы было больш за сорак. У 60-я гг. на базе арцелі створана фабрыка мастацкай керамікі, якая ў 1979 г. увайшла ў аб'яднанне "Беларуская мастацкая кераміка". Але майстры на фабрыцы гублялі сваю індывідуальнасць. Вытворчы план не спрыяў творчасці. Ганчарны цэх займаўся ліццём вырабаў у гіпсавых формах. Зараз, у XXI ст., у Івянцы аднаўляецца вытворчасць ганчарнай керамікі. Славу Івянцу ў XX ст. прынеслі такія майстры, як Звярко, Малчановіч, Пракаповіч і інш. Такім чынам, майстэрства некалькіх пакаленняў ганчароў Івянца ўплывала на творчасць мастака Угрыновіча. Ён стварыў дэкаратыўныя кампазіцыі "Неба і зямля"; "Подых зялёнага ветру"; дэкаратыўныя вазы і падсвечнікі, у якіх адлюстравана сістэма вобразнага разумення сусвету, "рытмы росту". У працы "Успаміны пра лета" мастак выкарыстоўвае palівы тыпу "кракле". Суадносіны і прапорцыі формаў у кампазіцыях мастака дакладна выверaны, пластыка вырабаў кранала сваёй мяккасцю, далікатнасцю. Гэта не выпадкова, бо У.В.Угрыновічу як чалавеку і мастаку ўласцівыя дабрыня, сціпласць, шчы-

расць, упэўненасць, руплівасць, прадбачлівасць і іншыя цудоўныя якасці.

Асоба Угрыновіча-даследчыка, таксама як і Угрыновіча-мастака, прыцягвае да яго людзей з самага пачатку яго дзейнасці. Уладзімір Вікенцьевіч сабраў і вызначыў асартыментныя групы ўжытковага посуду беларусаў. Некаторыя навукоўцы, у тым ліку браты Антон і Іван Луцкевічы, ужо спрабавалі гэта зрабіць. Імі была сабрана яшчэ ў пачатку XX ст. калекцыя керамікі, якая зараз знаходзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі ў Вільні пад назвай "Беларуская народная кераміка са збору братоў Луцкевічаў". Але ў працы па сістэматызацыі народнай керамікі ёсць многа складанасцей. Па-першае, трэба ўлічваць рэгіянальныя асаблівасці (напрыклад, гаршчок і збан, зробленыя на Гомельшчыне і на Віцебшчыне, маюць розныя сілуэты, пластыку і форму). Па-другое, маюць значэнне аўтарскія і стылёвыя характарыстыкі мастакоў-керамістаў. Посуд Малчановіча заўсёды можна пазнаць сярод прац іншых майстроў. Вызначальныя працы і Пракаповіча, аднаго са старэйшых івянецкіх майстроў-ганчароў, які і па сённяшні дзень працуе з глінай у Дудутках. Па-трэцяе, трэба ўлічваць характарыстыку хімічнага складу гліны і яе пластычныя якасці (кераміка Гародні мае светлы і цёплы колер, а з-пад Ржчыцы ці Віцебску — чырвоны, насычаны вокісламі металу). Гліны ўтрымліваюць розную колькасць пяску і іншых дамешак і па-рознаму фармуюцца).

Угрыновіч разумеў пластычную якасць гліны як матэрыялу. Цэнтральны рэгіён, да якога адносіцца Івянец, ён вывучыў дасканала. Івянец меў усе асартыментныя віды посуду яшчэ ў пачатку XX ст. У Івянцы створаны кухонны, сталовы, аптэчны, гігіенічны, будаўнічы і сувенірны асартымент вырабаў. Мясцовыя майстры былі лепшымі ў Еўропе. Тарны посуд у выглядзе буняк, глякоў і слояў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

пасля вайны амаль нідзе не выраблялі на тэрыторыі Беларусі, а ў Івянцы тачылі на 10, 15, 20 літраў слоі для мёду, журавін і грыбоў. У 70-я гг. яшчэ працавалі горны для абпалу. Па сённяшні дзень захаваліся каміны і грубкі, зробленыя з івянецкай кафлі.

У 1989 г. у Мінску выйшла кніга “Беларуская кафля” калектыву аўтараў, з якімі Уладзімір Вікенцьевіч супрацоўнічаў у Акадэміі навук Беларусі. Гэтае выданне ўтрымлівае цікавыя звесткі аб кафлярстве на тэрыторыі Беларусі, якое было вядома далёка за яе межамі. Беларускія майстры зрабілі значны ўклад у развіццё рускага кафлярства другой паловы XVII ст. Выхадцы з Магілёва, Мсціслава, Шклова, Копыся, Дуброўны і іншых гарадоў удзельнічалі ў збудаванні і ўпрыгожванні такіх выдатных помнікаў рускага дойлідства, як Васкрасенскі сабор Новаіерусалімскага манастыра, Іверскі манастыр на Валдаі, царква Грыгорыя Неакесарыйскага ў Ганчарах і інш. Ігнат Максімаў, Сцяпан Іваноў, Пётра Забойскі і іншыя таленавітыя майстры распаўсюджвалі новую тэхналогію вытворчасці паліхромнай кафлі, унеслі новае ў дэкарыраванне архітэктуры.

У кнізе “Беларуская кафля” Уладзімір Вікенцьевіч вельмі дакладна характарызуе беларускае кафлярства. Ён адзначаў, што ў суседняй Польшчы былі распаўсюджаны ганчарныя майстэрні, якімі кіравалі івянецкія майстры.

У.В.Угрыновіч праводзіў шматлікія навукова-творчыя экспедыцыі са студэнтамі кафедры. Яго прыватны збор мае многа вырабаў задымленай і гартаванай рабой керамікі. Ён быў захоплены магчымасцямі развіцця народнай традыцыйнай керамікі, экалагічна чыстай і па-мастацку дасканалай. Дачка мастака Вольга працягвае справу бацькі ў плане даследавання керамікі.

У мастацкай адукацыі патрэбны настаўнікі, якія валодаюць незвычайнымі якасцямі. Менавіта такімі якасцямі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

валодаў У.В.Угрыновіч. Ён шчыра і моцна любіў справу свайго жыцця і выхоўваў гэту любоў у студэнтаў. Сёння плённа працуюць у кераміцы яго выхаванцы Кіршына Тамара, Калітыгін Валерый, Прыешкін Валянцін, Байрачны Мікола, Кійко Рыгор, Сакалова Тамара, Крамко Юрый, Васюк Тамара, Пятроўская Таццяна, Раўко Зарына, Бусел Ян, Мусінская Яўгенія, Маліноўская Наталля, Шышлоў Мікалай, Слінькоў Уладзімір, Ляшэнка Алег і інш.

У нашай краіне працуе мастацкі камбінат дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Барысаве, але ён перажывае не лепшыя дні, хаця мастацкая кераміка патрэбна людзям. Ёсць спадзяванні, што яе вытворчасць расквітнее ў краіне. Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры ажыццявіў восем выпускаў мастакоў і выкладчыкаў па кераміцы, якія працуюць у Міры, Крупіцы, Гомелі, Навагрудку, Мінску. Яны навучаліся па базавай праграме Уладзіміра Вікенцьевіча Угрыновіча, якую перапрацавала аўтар гэтага артыкула. Многія выпускнікі БДУ культуры экспануюць свае аўтарскія працы на рэспубліканскіх і замежных выставах. У 2002 г. працы студэнтаў і выкладчыкаў кафедры народных рамёстваў універсітэта культуры экспанаваліся ў Гайнаўцы (Польшча) і ў Рыме ва універсітэце культуры. Кераміст Алег Ткачоў атрымаў “Гран-пры” і прэмію ад ААН на рэспубліканскай маладзёжнай выставе ў Палацы мастацтва ў Мінску і першую прэмію на Славянскім базары ў Віцебску ў намінацыі “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”. Многія студэнты з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры сталі ўдзельнікамі і лаўрэатамі рэспубліканскага конкурсу па падрыхтоўцы таленавітай моладзі. Такі працяг ужо ў трэцім пакаленні творчай, навуковай і педагагічнай дзейнасці надзвычай таленавітага, шчырага, добрага, разумнага, пяшчотнага, праніклёнага і бязмежна адданага сваёй справе чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ